# “Ліда – сталіца Дня беларускага пісьменства”

Інтэлектуальная гульня для вучняў IX – XI класаў

**Марыя Міхайлаўна Коўшык**,
настаўніца рускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Канюхоўскай сярэдняй школы
Бераставіцкага раёна

**Дзень беларускага пісьменства – гэта свята духоўнасці, нацыянальнай культуры і кнігадрукавання. Штогод ён праводзіца ў гарадах з багатай гістарычнай спадчынай. У гэтым годзе сталіцай свята стане Ліда. Дадзеная інтэлектуальная гульня дапаможа навучэнцам паглыбіць веды па гісторыі і культуры горада і краю. Перад правядзеннем гульні можа быць праведзена падрыхтоўчая работа, таксама можна прапанаваць школьнікам пазнаёміцца з гістарычнымі крыніцамі.**

**Мэта:** паглыбіць і сістэматызаваць веды пра Дзень беларускага пісьменства; вызначыць цікавыя факты пра Ліду, сталіцу беларускага пісьменства – 2025; пашыраць кругагляд, развіваць інтэлектуальныя і пазнавальныя здольнасці навучэнцаў; падтрымліваць цікавасць да духоўнай спадчыны.

**Абсталяванне:** інтэрактыўная панэль (мультыборд), прэзентацыя, карткі з заданнямі.

**Умовы правядзення:** навучэнцы дзеляцца на каманды (2-3 каманды па шэсць вучняў. Перамагае тая каманда, якая набярэ большую колькасць балаў).

## Ход гульні

### I. Арганізацыйны этап

*Каманды займаюць месцы. Вядучы прадстаўляе ўдзельнікаў гульні і членаў журы, тлумачыць правілы гульні.*

### II. Асноўны этап

**Вядучы**. Кожны год у першую нядзелю верасня мы адзначаем вельмі значнае ў нашым духоўным жыцці свята – Дзень беларускага пісьменства. Свята, якое набыло міжнародны аўтарытэт, якое з нецярплівасцю чакаюць, за права прыняць якое змагаюцца гарады. Сталіца Дня беларускага пісьменства

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

выбіраецца штогод – гэта мусіць быць мясціна з багатай гістарычнай спадчынай.

У 2025 годзе сталіцай XXXII Дня беларускага пісьменства стане вельмі прыгожы і цікавы горад Ліда, другі па велічыні ў Гродзенскай вобласці горад, які ў XIV–XVI стагоддзях уваходзіў у першую пяцёрку гарадоў Вялікага Княства Літоўскага.

Сёння мы запрашаем вас прыняць удзел у інтэлектуальнай гульні “Ліда – сталіца Дня беларускага пісьменства”.

**Першы тур. “Ліда: гісторыя і легенды”**

1. Адкуль пайшла назва Ліда? (*паходзіць ад балтыйскага lyda або lydimas, блізкага да славянскага тэрміна ляда – апрацаванае поле на месцы высечанага лесу.)*

2. Узрост любога горада вылічваецца ад першага пісьмовага згадвання пра яго. Калі ўпершыню згадваецца Ліда? *(1323 год.)*

3. Хто ўпершыню пісьмова згадаў Ліду? *(Вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Гедымін у сваім тастаменце, складзеным незадоўга да смерці.)*

4. У якім годзе горад Ліда атрымаў магдэбургскае права? *(У 1590 годзе Жыгімонт III Ваза надае Лідзе магдэбургскае права.)*

5. Назавіце прозвішча татарскага хана, якога вялікі князь літоўскі Вітаўт пасяліў у Лідзе? Чаму? *(Хан Тахтамыш. Яшчэ нядаўна грозны ўладар Залатой Арды, які наводзіў жах на Русь, быў скінуты з залатаардынскага трона і апынуўся ў Вялікім Княстве Літоўскім у ролі выгнанніка. Вітаўт прыняў яго ветліва, як ганаровага госця, бо бачыў у перабежчыку сілу, якую збіраўся выкарыстаць у сваіх мэтах.)*

6. Знайдзіце сярод гербаў гарадоў, якія з’яўляліся сталіцамі Дня беларускага пісьменства, герб Ліды. *(Выявы дэманструюцца на інтэрактыўнай панэлі (мультыбордзе*.)



**Адказы:** 1 – Бялынічы; 2 – Добруш; 3 – Ліда; 4 –Тураў.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

7. Што сімвалізуе герб Ліды? (*Герб Ліды ўяўляе сабой барочную тарчу (гербавы шчыт), разбітую вертыкальна. Паводле легенды, два ключы ад брамы раю і пекла былі ўручаны Ісусам апосталу Пятру. Верагодна, яны могуць быць ключамі ад раю для тых, хто бясстрашна ваяваў за свабоду і росквіт роднай зямлі. Леў – гэта моцная, мудрая, а галоўнае, высакародная жывёла, нездарма празваная царом звяроў. Пастава атакі, пашча з высунутым языком кажуць пра тое, што горад можа даць адпор ворагам, якія прыйшлі на гэтую зямлю. Чырвоны колер фону, на якім выяўлены цар звяроў, сімвалізуе кроў, пралітую абаронцамі горада.)*

8. Назавіце дату, калі горад Ліда быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў? *( 8 ліпеня 1944 года.)*

9. Назавіце старажытныя храмы, якія знаходзяцца ў Лідзе. *(Праваслаўны Свята-Міхайлаўскі кафедральны сабор; касцёл Узвіжання Святога Крыжа.)*

10. Гэты помнік у Лідзе быў адкрыты 25 ліпеня 1993 года. Устаноўлена скульптура недалёка ад Лідскага замка, ва ўтульным зялёным скверы. Прысвечана знакамітаму асветніку-гуманісту эпохі Рэнесансу, першадрукару, грамадскаму дзеячу, вучонаму-медыку. Назавіце яго імя. *(Францыск Скарына.)*

11. Адна з вуліц Ліды осіць імя паэта, якога лічаць сваім адразу некалькі народаў – беларусы, палякі, літоўцы. Нарадзіўся ён недалёка ад Ліды – на Навагрудчыне, у маёнтку Завоссе. Назавіце імя і прозвішча паэта. *(Адам Міцкевіч.)*

*(Журы падлічвае набраныя камандамі ў першым туры балы.)*

**Вядучы.** Калі дакранешся рукой да замшэлых замкавых сцен, міжволі думаеш: як жа людзі маглі тады, у далёкім XIV ст. узвесці яго без механізмаў і машын? Любы сярэдні камень з кладкі сцяны важыць столькі, што яго ледзь адарвуць ад сцяны двое дужых мужчын. А колькі іх, такіх пасляледніковых "гарошын", у сценах двухметровай таўшчыні! Самыя сціплыя падлікі паказваюць, што было сабрана і прывезена каля 23 000 м$^3$ валуноў. Кожны з іх трэба было падабраць адпаведна колеру, памеру і старанна абчасаць. Ці ўзяць тую ж цэглу! Каля паўтара мільёна штук лягло ў іх сцены, і праз шэсць з паловай стагоддзяў цэгла як звон – хоць у печ, хоць у падмурак.

У час археалагічных раскопак давялося пераканацца, што Лідскі замак каменны ў пэўным сэнсе слова. Тут нават замкавы двор поўнасцю забрукаваны. Ды не ў адзін, а ў тры ярусы.

Сёння цяжка сабе ўявіць, што значыла замкавая павіннасць. Страшэнным цяжарам клалася яна на плечы гвалтам адарванага ад дому, сям'і, гаспадаркі рамесніка і селяніна-ратая. Халодным цяжкім валуном дакаціўся да

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

нас праклён *“Каб ты каменні на замак цягаў...”* Водгалас тых пачуццяў і перажыванняў – у народнай песні:

На цівунскім полі
Камяні цягалі,
А з тых каменняў
Муры будавалі.
Вежа паднялася
Над самай вадою,
Дзе мой слаўны сокал
Засеў за сцяною...

Няма сумнення, што замак у Лідзе будавалі перш-наперш самі гараджане, а таксама сяляне бліжніх і дальніх ваколіц. Але паколькі гэта быў важны стратэгічны фарпост, то для нарыхтоўкі жвіру, каменю, вапны і цэглы прыцягваліся рабочыя рукі з іншых тэрыторый Беларусі.

**Другі тур. “Загадкі замка Гедыміна”**

1. Што з’яўляецца сімвалам горада Ліда? *(Лідскі замак.)*

2. Узнавіце назву замка, суаднясіце фота замкаў з іх апісаннем.

| | |
|---|---|
| **1**  | **1.** Замак вядомы як палац Пуслоўскіх. Будаўніцтва яго працягвалася 10 гадоў. Архітэктурны стыль вызначаны як неаготыка. Мае правільную геаметрычную форму і сіметрычную кампазіцыю са значным перападам вышыні. Яго часам называюць “маленькі замак”. Кожная з 12 вежаў васьмікутнай формы ў плане сімвалізуе адзін з месяцаў года. |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | |
|---|---|
| <br>**2** | **2**. Замак пабудаваны ў 1320-я гады. Уваходзіў у лінію процікрыжацкай абароны Навагрудак – Крэва – Меднікі – Трокі. За аснову замка ўзяты тып абарончага збудавання, вядомага пад назвай *кастэль.* Быў пастаўлены на насыпным пясчаным узгорку (вышыня 5 – 6 метраў), абкружаны балоцістымі берагамі рэк Лідзея і Каменка, з поўначы – ровам шырынёй каля 20 метраў. |
| <br>**3**<br>3 | **3.** Помнік архітэктуры XVI – XVIII стагоддзяў. Закладзены князем М.К. Радзівілам Сіроткам у 1583 г. на паўднёвым захадзе ад Нясвіжа, на месцы драўлянага замка. У XVI–XX стст. – рэзідэнцыя князёў Радзівілаў. Уключае ў сябе ўласна замак, замкавыя ўмацаванні, а таксама вялікі ландшафна-пейзажны парк. |
| <br>**4** | **4**. Адзін з нацыянальных сімвалаў Беларусі. Архітэктурны комплекс уключае ў сябе замак XVI–XX стст., валы XVI–XVII стст., прыдарожную каплічку, капліцу-пахавальню князёў Святаполк-Мірскіх з домам вартаўніка і брамай, пейзажны і рэгулярны паркі. |

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | |
|---|---|
| | З’яўляецца самым усходнім гатычным збудаваннем, а таксама самым буйным і адзіным някультавым аб’ектам з захаваных узораў самабытнай беларускай готыкі. |

**Адказы:** 1-ы фотаздымак – Нясвіжскі замак (3); 2-і фотаздымак – Мірскі замак (4); 3-і фотаздымак – Косаўскі замак (1); 4-ы фотаздымак – Лідскі замак (2).

3. З якой мэтай быў узведзены замак Гедыміна? *(Для абароны ад нападаў крыжаносцаў і бяспекі Ліды як важнага гандлёвага і культурнага цэнтра княства.)*

4.Колькі гадоў будаваўся Лідскі замак? (К*аля пяці-сямі гадоў.)*

5. Што звязвае замак Гедыміна з цыркам, стадыёнам і коўзанкай? *(У летні перыяд тут раз-пораз спыняліся прыезджыя заапаркі і цыркі, а зімой на тэрыторыі замка ладзілі каток.)*

6. Чаму ў 1891 годзе паўднёва-заходняя частка вежы і частка муру былі разабраныя гараджанамі? *(У гэтым годзе адбыўся моцны пажар, таму ўлады прынялі рашэнне выкарыстаць матэрыялы ўмацавання для адбудовы горада.)*

7. Лідчына для многіх мастакоў была крыніцай натхнення і месцам духоўнага стаўлення. Назавіце майстроў пэндзля і алоўка, якія найбольш ярка ў сваіх карцінах адлюстроўвалі замак. (*Юзаф Пешка, Напалеон Орда, Міхал Кулеш, Язэп Драздовіч.)*

8. У гэтым замку ў 1382 годзе быў забіты вялікі князь Кейстут, а яго сыну Вітаўту ўдалося ўцячы. У 1385 годзе тут паміж Польшчай і Вялікім Княствам Літоўскім была падпісана знакамітая унія. Ён, як і Лідскі замак, з’яўляюцца двума ўзорамі кастэляў на тэрыторыі Беларусі. Назавіце гэты замак. *(Крэўскі замак.)*

*(Журы падлічвае набраныя камандамі ў другім туры балы.)*

**Трэці тур. “Валянцін Таўлай: з Лідай лёсам знітаваны”**

Разгадайце крыжаванку, прысвечаную Валянціну Паўлавічу Таўлаю, беларускаму паэту, літаратуразнаўцу, грамадскаму дзеячу.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА




**Пытанні:**

1. Першы верш паэта.
2. Горад, у якім пахаваны паэт.
3. Горад, у якім у польскай школе вучыўся Валянцін Таўлай.
4. Настаўніцкая семінарыя, якую закончыў Валянцін Таўлай.
5. Імя, якое насіў партызанскі атрад, сувязным якога з’яўляўся Валянцін Таўлай у гады Вялікай Айчыннай вайны.
6. Горад, у якім нарадзіўся Валянцін Таўлай.
7. Вёска, у якой прайшло дзяцінства Валянціна Таўлая.

**Адказы:** 1. Верабейкі. 2. Мінск. 3. Ліда. 4. Слонімская. 5. Катоўскі. 6. Баранавічы. 7. Рудаўка.

*(Журы падлічвае набраныя камандамі ў трэцім туры балы.)*

**Чацвёрты тур. “Лідчына літаратурная”**

1. *Где-то там, из-под небес, нас благодарит “дзеяч”:*
   *Благодарен Вам, Лида! Ваш И.Д. Луцевич...”*

Назавіце літаратурны псеўданім І.Д. Луцэвіча. З якой нагоды паэт прыязджаў у Ліду? (*Янка Купала. Паэт прыязджаў у Ліду ў якасці кандыдата ў дэпутаты па Лідскай-Слабадской акрузе № 306.)*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

2. Якім чынам у Лідзе ўвекавечана памяць пра Валянціна Таўлая, беларускага паэта?

*(Яго імя носіць вуліца і бібліятэка; у доме па вуліцы Замкавай ,7, дзе жыў Валянцін Таўлай, быў адкрыты музей – аб'ект Лідскага гісторыка-мастацкага музея; на будынках – доме-музеі і рэдакцыі "Лідскай газеты" адкрыты мемарыяльныя дошкі; у 2014 годзе выпушчаны канверт, прысвечаны Валянціну Таўлаю.)*

3. У Вільні ён выдаў евангелічны "Катэхізіс" (1598), яму прыпісваюць аўтарства манускрыпта "Думкі літвіна, пра танную куплю і дарагі продаж збожжа"(1595), пры ім Ліда атрымала герб і магдэбургскае права. Назавіце яго імя. *(Ян Абрамовіч.)*

4. Паэтка (*літаратурны псеўданім Цётка*), празаік і публіцыст, якая нарадзілася ў шматдзетнай шляхецкай сям'і ў маёнтку Пешчына Лідскага павета. Адна з самых высакародных, шляхетных і рамантычных асоб свайго часу. Назавіце яе сапраўднае імя. (*Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч.)*

5. Аўтар шматлікіх зборнікаў сатырычных вершаў, баек і фельетонаў (кнігі "Сіняк" (1964), "Дзям'янава юшка" (1970), "Жук і мёд" (1980). "Дакладныя прыкметы" сваіх герояў ведаў як ніхто іншы. З канца 1946 па студзень 1948 года працаваў дырэктарам цвіковага завода ў горадзе Ліда (цяпер завод электравырабаў). *(Уладзімір Корбан.)*

6. Рускі і савецкі гісторык літаратуры, літаратурны крытык, літаратуразнаўца, перакладчык, прэзідэнт Дзяржаўнай акадэміі мастацкіх навук. Нарадзіўся ў сям'і лідскага лекара. *(Пётр Сямёнавіч Коган.)*

7. Пад казачным дубам
над Нёманам сінім
хлапец прызнаваўся ў каханні
дзяўчыне.

І рэхам той шэпт
Адгукаўся між гаю:
...Кахаю, кахаю...

Аўтар гэтага верша нарадзілася ў сялянскай сям'і ў вёсцы Біскупцы Лідскага павета Навагрудскага ваяводства, скончыла аддзяленне беларускай мовы, літаратуры і гісторыі Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы. Укажыце назву верша, імя і прозвішча аўтара. *(Данута Бічэль. "Роднае слова".)*

*(Журы падлічвае набраныя камандамі ў чацвёртым туры балы.)*

**III. Заключны этап**

**Вядучы.** Дзень беларускага пісьменства – гэта сімвал шанавання культурнай і духоўнай спадчыны Беларусі. Ён паказвае адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа, адлюстроўвае гістарычны шлях пісьменства і друку ў Беларусі, тым самым яднаючы мінулае, цяперашняе і будучыню, зберагаючы сувязь пакаленняў.

Ліда з гонарам і годнасцю будзе прымаць XXXII свята, каб пасля перадаць эстафету новай сталіцы з багатай гістарычнай спадчынай.

*Журы падводзіць вынікі гульні і ўзнагароджвае пераможцаў.*

## Літаратура

Гедымін [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: by.vklby.com›asoby/gedymin. – Дата доступу: 12.06.2025.

Гісторыя Ліды [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org. – Дата доступу: 16.06.2025.

Легенды Лідскага замка [Электронный ресурс]. – Режым доступу: https:// pawet.net›files/l_legendy.pdf . – Дата доступу: 13.06.2025.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА